Сучасны падыход

# «БУКВАР» З НАЦЫЯНАЛЬНЫМ КАЛАРЫТАМ

## і ўлікам узроставых асаблівасцяў

**Кожны, мабыць, можа прыгадаць, з якім пачуццём браў у рукі свой першы «Буквар». Як адчуваў пах свежанадрукаванай кнігі, спяшаўся пагартаць яе, як вабіла таямніца слоў, што адкрывалася тады, калі зразумееш сэнс напісанага... З такой жа кніжкі, але зробленай па-новаму, цяпер будуць пачынаць знаёмства з літарамі, вучыцца чытанню і спазнаваць нашу краіну беларускія першакласнікі ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай мовай навучання. Новы «Буквар» стварылі ў Нацыянальным інстытуце адукацыі, і ён мае шэраг адметнасцяў, а таксама карысных сюрпрызаў для будучых школьнікаў. Пра іх мы і распыталі аўтараў новага навучальнага дапаможніка Вольгу СВІРЫДЗЕНКУ і Вольгу ЦІРЫНАВУ.**




— Мы вельмі стараліся, каб новы «Буквар» быў сучасным, прыгожым, пазнавальным, каб першакласнікам было цікава вучыцца па ім чытаць, каб ім хацелася гартаць гэтую кніжку зноў і зноў. Каб менавіта такім ён прыйшоў у школу, спатрэбілася праца многіх людзей: гэта і педагогі, з якімі мы абмяркоўвалі свае ідэі на рэспубліканскім семінары, і метадысты Нацыянальнага інстытута адукацыі, і рэцэнзенты вучэбнага выдання, і ўсе супрацоўнікі выдавецкага цэнтра Нацыянальнага інстытута адукацыі, рэдактары, мастакі, карэктары, — распавядае Вольга Свірыдзенка. — Нягледзячы на тое, што кожны з нас да напісання беларускага буквара ўжо меў вопыт падрыхтоўкі падручнікаў і вучэбных дапаможнікаў, работа па стварэнні вучэбна-метадычнага комплексу «Навучанне грамаце» стала першым нашым сумесным праектам і мы засталіся задаволеныя супрацоўніцтвам, паколькі ў агульным праекце змаглі спалучыць найлепшыя ўласныя напрацоўкі.

**Стваральнікі адзначаюць, што буквар як асобная кніга нясе ў сабе вялікі выхаваўчы патэнцыял. Ён дапамагае першакласнікам спасцігаць галоўныя агульначалавечыя і нацыянальныя каштоўнасці: сяброўства, любоў да Радзімы, да сваякоў, клопат пра старэйшых і дапамога малодшым.**

Так, у працэсе работы над «Букварам» аўтары сумесна пераадольвалі ўсе цяжкасці, звязаныя з тым, каб выконвалася асноўнае прызначэнне гэтай кнігі — навучыць дзяцей чытаць. З увядзеннем кожнай новай літары даводзілася вырашаць складаныя задачы, звязаныя з падборам слоў і стварэннем тэкстаў навучальнага і выхаваўчага характару. У новым буквары трэба было ўлічыць інтарэсы сучасных дзяцей, якія жывуць у інфармацыйнай прасторы і актыўна карыстаюцца электроннымі сродкамі яшчэ ў дашкольным узросце. Таму на старонках новага вучэбнага дапаможніка ідзе размова і пра камп'ютар, і пра Skype, і пра мабільныя тэлефоны, і пра інтэрнэт. Аднак яго стваральнікі імкнуліся данесці да сучаснага дзіцяці, што электронныя сродкі можна выкарыстоўваць не толькі для гульні, але і для навучання. Так з'явілася ідэя з прымяненнем QR-кодаў на старонках вучэбнага выдання.

— Паколькі мы добра ведаем узроставыя асаблівасці першакласнікаў і разумеем, што пераход ад гульнявой да вучэбнай дзейнасці адбываецца ў іх паступова, вучні яшчэ доўга не страчваюць цікавасці да цацак і мультфільмаў, улічылі гэта і ў рабоце над букваром, — дзеліцца Вольга Цірынава. — Таму серыя анімацыйных фільмаў «Беларуская азбука» Нацыянальнай кінастудыі «Беларусьфільм» стала той знаходкай, якая дапамагла нам у стварэнні электроннага кантэнту. Мы вельмі ўдзячныя кіраўніку «Беларусьфільма» Уладзіміру Карачэўскаму і яго супрацоўнікам: дырэктару студыі анімацыйных фільмаў Ігару Галіноўскаму, кінарэжысёрам-пастаноўшчыкам Канстанціну Андрушачкіну, Ірыне Тарасавай і Уладзіміру Пяткевічу за тое, што ў сучасным буквары з'явілася дапоўненая рэальнасць.

Думаю, бацькі, чые дзеці любяць мультфільмы, прыгадаюць дзяўчынку Кірыліцу, якая ў займальнай форме распавядае пра кожную з літар беларускага алфавіта. Гэты анімацыйны праект на «Беларусьфільме» стваралі на працягу некалькіх гадоў, і складаецца ён з чатырох фільмаў. Для вучэбнага дапаможніка іх разбілі на маленькія мультфільмы, кожны з якіх знаёміць з асобнай літарай у кніжцы.

— Пачынаў гэты анімацыйны праект Уладзімір Пяткевіч. Ён з'яўляецца рэжысёрам першых двух фільмаў. А потым работу над цыклам падхапіла я. З самага пачатку было зразумела, што ідэя ўвасобіць у мультыплікацыйнай форме беларускую азбуку выдатная. А ўжо пасля мы ўсвядомілі, якая ў гэтым хаваецца дыдактычная каштоўнасць і што такі матэрыял будзе запатрабаваны дзецьмі, — кажа **рэжысёр Нацыянальнай кінастудыі «Беларусьфільм» Ірына ТАРАСАВА.** — І сёлета для нас стала прыемнай нечаканасцю, што выйшаў новы буквар з нашымі фільмамі. Для маёй сям'і гэта ўвогуле вялікі падарунак, паколькі ў мяне сёлета і дачка пайшла ў першы клас, а мой муж працаваў над гэтым праектам ад пачатку і да завяршэння. Цудоўна, што стваральнікі новага буквара падумалі пра тое, як зрабіць яго сучасным. Цяпер у дзяцей будзе магчымасць з захапленнем засвойваць вучэбны матэрыял!

Яшчэ адной адметнасцю новага вучэбнага дапаможніка варта лічыць яго нацыянальны кантэнт. Стваральнікі адзначаюць, што буквар як асобная кніга нясе ў сабе вялікі выхаваўчы патэнцыял. Ён дапамагае першакласнікам спасцігаць галоўныя агульначалавечыя і нацыянальныя каштоўнасці: сяброўства, любоў да Радзімы, да сваякоў, клопат пра старэйшых і дапамога малодшым. Вучыць працавітасці, самастойнасці, адказнасці за свае ўчынкі. Нацыянальнаму складніку ў змесце буквара аддадзена вялікая ўвага. На старонках вучэбнага выдання першакласнікі пазнаёмяцца з раслінамі, жывёламі, прадметамі і рэчамі, сімвалічнымі для беларусаў (валошкі, зубр, бусел, цымбалы, рушнікі і г. д.). Тэматыка тэкстаў для чытання таксама цесна звязаная з Беларуссю, што дае магчымасць засвойваць веды пра раслінны і жывёльны свет, рэкі, замкі і памятныя мясціны нашай краіны.

— На старонках буквара шырока выкарыстоўваецца беларускі арнамент. Па-першае, ім упрыгожана кожная новая літара. Па-другое, заніраванне вучэбнага матэрыялу зроблена пры дапамозе арнаменту, у якім прадстаўлены сімвалы маці, дзіцяці, сонца, жыцця — усяго таго, што з'яўляецца перадумовай гарманічнага развіцця першакласніка, яго імкнення да ведаў, — тлумачыць Вольга Свірыдзенка.

**У новым буквары трэба было ўлічыць інтарэсы сучасных дзяцей, якія жывуць у інфармацыйнай прасторы і актыўна карыстаюцца электроннымі сродкамі яшчэ ў дашкольным узросце.**

Варта адзначыць, што восенню ў дапаўненне да новага «Буквара» з'явіцца яшчэ і вучэбнае выданне «Спадарожнік буквара». У ім будзе прадстаўлена сістэма заданняў для дыферэнцыраванай работы з вучнямі, якія ўмеюць чытаць. Змест выдання ўключае творы, розныя па аб'ёме і ступені складанасці, што дазваляе арганізаваць работу з вучнямі з улікам узроўню навыку чытання (ад паскладовага чытання да чытання цэлымі словамі). У выданні «Спадарожнік буквара» таксама прадстаўлены электронны кантэнт краязнаўчага характару (відэаролікі пра Белавежскую пушчу, Нясвіжскі і Мірскі замкі, Мемарыяльны комплекс «Хатынь», Беларускі рэспубліканскі цэнтр алімпійскай падрыхтоўкі па зімовых відах спорту «Раўбічы» і іншае).

Хоць афіцыйная прэзентацыя «Буквара» плануецца толькі 3 верасня ў Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі, але ўжо ў першы дзень новага навучальнага года ўсе першакласнікі атрымалі яго ў школе.

**Алена ДРАПКО.**
**Фота з архіва аўтараў «Буквара».**

**ООО «Деловая оценка» (организатор аукциона) по поручению ОАО «Борисовский завод полимерной тары «Полимиз» (продавец) извещает о проведении 15 сентября 2021 года открытого аукциона по продаже имущества в 12.00 по адресу: Гомельская обл., г. Гомель, ул. Жарковского, д. 24, каб. 3-2**

| № лота | Наименование имущества | Начальная цена продажи с НДС, бел. руб. | Задаток (10 %) с НДС, бел. руб. |
| --- | --- | --- | --- |
| 1 | Ножницы кривошипные НД3318Г (1212), станок заточной 3622Д (1239), выпрямитель сварочный ВД-306 У3 (1627), ножницы-пресс НА-633 (1630), фрезерный станок 676П (1662), вертикально-сверлильный станок 2С132К (1789), станок долбежный ГД320 (1842), пресс ручной винтовой ПР-1 (2073), станок токарный МК6056 (2339), полуавтомат сварочный СПАР ПДГ 250 (2567), пылеулавливающий агрегат ПУМА-800 (2583), пылеулавливающий агрегат ПУМА-800 (2584), пылеулавливающий агрегат ПУМА-800/SP (2664), станок шлифовальный (2641), установка для аргонно-дуговой сварки УДГУ 351 AC/DC (2642), металлообрабатывающий ленточный станок G5018WA (2720), настольный сверлильный станок Е-1516В/230 (2767), точильно-шлифовальный станок 3Б634 (556), токарно-винторезный станок РТ 492 (1661), фрезерный станок 6К82Ш (2016), плоскошлифовальный станок 3Г71 (497), штабелер РА 1016 (3220) | 39 463,20 | 3 946,32 |

**Продавец: ОАО «Борисовский завод полимерной тары «Полимиз»**, Минская область, г. Борисов, ул. Ибаррури, 42. Контактный телефон +375 29 655 50 51.

**Шаг аукциона – 5 % от начальной цены лота в фиксированной сумме.**

**Для участия в аукционе необходимо:**

**1**. Оплатить задаток на расчетный счет **Организатора аукциона ООО «Деловая оценка»: р/с BY60BELB30121322650030226000 в филиале ОАО «Банк БелВЭБ», г. Гомель, ул. Советская, 71, БИК BELBBY2X, УНП 490870026.**

**2.** Подать заявление организатору аукциона по установленной форме с приложением необходимых документов по адресу: г. Гомель, ул. Жарковского, д. 24, каб. 3-2 в рабочие дни с **10.00 до 13.00** и **14.00 до 17.00** от даты опубликования настоящего извещения. **Прием заявлений для участия в аукционе заканчивается 13.09.2021 г. в 17.00.**

**Для участия в аукционе представляются:** документ, подтверждающий внесение суммы задатка (задатков) на текущий (расчетный) банковский счет, указанный в извещении, с отметкой банка; юр. лицом или индивидуальным предпринимателем (далее ИП) Республики Беларусь – копия документа, подтверждающего государственную регистрацию этого юр. лица или ИП; иностранным юр. лицом – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны учреждения (выписка должна быть произведена не ранее шести месяцев до подачи заявления на участие в торгах) либо иное эквивалентное доказательство юр. статуса в соответствии с законодательством страны учреждения с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык; иностранным ИП – легализованный в установленном порядке документ, подтверждающий статус, с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык; представителем юр. лица Республики Беларусь – доверенность; представителем гражданина или ИП Республики Беларусь – нотариально удостоверенная доверенность; представителем иностранного юр. лица, иностранного физ. лица или ИП – доверенность, легализованная в установленном законодательством порядке, с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык. При подаче документов заявитель (его представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, а руководитель юр. лица – также документ, подтверждающий его полномочия.

**Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее чем за 3 (три) дня до его проведения.** В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником или для участия в нем явился только один участник, объект аукциона продается этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на **5 (пять)%.** Победителем торгов будет признан участник, предложивший более высокую цену. Лицо, являющееся победителем торгов, обязано: подписать протокол о результатах аукциона; заключить договор купли-продажи в течение **5 (пяти)** календарных дней с момента подписания протокола; оплата должна быть произведена в течение **10 (десяти)** рабочих дней после подписания договора купли-продажи. Возместить затраты на организацию и проведение аукциона и оплатить вознаграждение организатору торгов в течение **5 (пяти) рабочих дней** с момента подписания протокола. Задатки, уплаченные участниками аукциона, ставшими победителями, будут учтены в счет окончательной стоимости предмета оценки. Проводится аукцион в соответствии с Положением Общества с ограниченной ответственностью «Деловая оценка» о порядке организации и проведения аукционов по продаже имущества и права на заключение договоров аренды нежилых помещений (их части).

**Дополнительная информация по контактным телефонам организатора аукциона: +375 (232) 34-62-36, +375 (44) 750-40-03, +375 (29) 303-30-62 и на сайте www.deloocenka.by**

**ЗАО «БЕЛРЕАЛИЗАЦИЯ» ОБЪЯВЛЯЕТ АУКЦИОН**

Организатор торгов: ЗАО «Белреализация» (УНП 191113330), 220089, г. Минск, ул. Уманская, 54, 4-й этаж паркинга, каб. 28, тел.: (8017) 298-53-53; (8029) 690 54 09, BELTORGI.BY

Продавец: **Государственное предприятие «НПЦ по геологии»** (УНП 192018546) 247050, 220141, г. Минск, ул. Купревича, д. 7, ком. 206, тел.: 248-69-24; тел.\факс (017) 373-71-15

Публичные торги в электронной форме будут проведены: **05 октября 2021 г. 09.00–17.00** на электронной торговой площадке **BELTORGI.BY**.

| № п/п | Предмет торгов | Начальная цена предмета торгов, бел. руб. с НДС |
| --- | --- | --- |
| 1 | Трансформатор ТМГ-12-400-У1 10/0,4, 2 шт. | 8787,14 |
| 2 | Трансформаторная подстанция 250 кВт и трансформаторная подстанция КПТТАС-63 кВа 10/0,4 | 4376,02 |
| 3 | Кабель АБЛУ 3х120 – 375 метров, кабель АВБбШв 4х35 – 845 метров, кабель АСБл-10 3х35 – 995 метров | 2226,55 |

Местонахождение – г. Слуцк, ул. Ленина, 293.

**Для участия в торгах необходимо** в срок с 03.09.2021 г. 09.00 по 04.10.2021 г. 17.00: 1) зарегистрироваться и подать заявку по выбранному лоту на участие в торгах на сайте BELTORGI.BY; 2) перечислить задаток по выбранному лоту на р/с BY33BPSB30121854590139330000 в ОАО «БПС-Сбербанк», код BPSBBY2X, УНП 191113330, получатель – ЗАО «Белреализация».

Шаг торгов – 5 %, задаток – 10 % от начальной цены предмета торгов. Организатор торгов вправе отказаться от их проведения не позднее, чем за день до наступления даты проведения торгов. Торги проводятся при наличии не менее двух допущенных к участию в них участников. Победителем торгов признается лицо, предложившее наиболее высокую цену. Если заявка на участие в торгах подана только одним участником, торги признаются несостоявшимися. Предмет торгов продается претенденту на покупку при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов. Результаты торгов оформляются в виде протокола. Победитель торгов (претендент на покупку) обязан в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов возместить сумму фактических затрат, связанных с организацией и проведением торгов, и оплатить аукционный сбор. Срок заключения договора купли-продажи и оплаты предмета торгов – не позднее 10 рабочих дней со дня проведения торгов.